Нефармат

Здрадзіць усім адразу

Таму і пішу пра яго, што заўсёды паважала гэтага артыста. Лічыла яго сапраўдным, чалавечным, з талентам і сумленнем, у адрозненне ад многіх таварышаў па цэху. Ды і наогул сёння пералічанае — хутчэй рэдкасць у асяродку медыйных персон, таму так важна... І хоць піў ён многа, пра што ведалі ўсе, але, як кажуць, талент не прап'еш, а гены пальцам не раздушыш. Вы, мабыць, здагадаліся: зараз кажу пра артыста Міхаіла Яфрэмава і тую страшную аварыю, якую ён здзейсніў, правільней сказаць, забойства на дарозе.

Думаю, усе чыталі, што 8 чэрвеня у Маскве на Садовым коле Яфрэмаў учыніў ДТЗ. Яго аўтамабіль выскачыў на сустрэчную паласу і пратараніў грузавічок кур'ерскай службы дастаўкі далікатэсаў. 57-гадовы кіроўца Сяргей Захараў загінуў. Яфрэмаў быў п'яны, у крыві пазней зафіксавалі 2,1 праміле алкаголю. Артыст чакае суда пад дамашнім арыштам.

Многія славутыя і не вельмі вядомыя персоны выказаліся з гэтай нагоды. Адны падтрымліваюць і спачуваюць, іншыя непрымірыма асуджаюць. І тое, і другое мае права на жыццё. Здзейснена злачынства. Галоўнае, што чалавека, які падтрымліваў сваю сям'ю, дапамагаў хворай маці, ужо не вернеш. І гэта, як ні круці, становіцца галоўным вынікам такога бурнага, яркага, насычанага падзеямі жыцця акцёра.

Зазірнула ў «Вікіпедыю», дзе выкладзена радаслоўная цяперашняга артыста тэатра «Сучаснік». Аказваецца, ён інтэлігент нават не ў трэцім, а ў многіх пакаленнях. Яшчэ прапрадзеды і прапрабабулі Міхаіла вызначыліся сваімі заслугамі ў навуцы, літаратуры і мастацтве, прадзеды і прабабулі — таксама. Дзед — народны артыст СССР, бабуля — рэжысёр і прафесар. Бацькоў артыста ўсе ведаюць — народныя артысты Алег Яфрэмаў і Ала Пакроўская. Дарэчы, маці памерла толькі летась, і, выходзіць, яе шчасце, што не ўбачыла такой бяды з сынам... Дык вось я пра тое, што спадчыннасць і база для ўласнага развіцця, кар'еры, дабрабыту, калі хочаце, была як ні ў кога другога. Маю на ўвазе не толькі і не столькі матэрыяльны бок. Гэта вам не рабоча-сялянскі хлопчык з якой-небудзь Самары, што прыехаў штурмаваць тэатральны інстытут у спадзяванні на свае здольнасці. Міхаіл Алегавіч вырас у творчым асяродку, першы акцёрскі вопыт атрымаў у школьныя гады, сваё развіццё як акцёр пачаў у юным узросце, ну і, вядома, меў усебаковую падтрымку ад сям'і. Вось толькі адказнасць перад тымі, хто пасапраўднаму быў шчаслівы за яго поспехі, у сабе развіць так і не змог. Вынік вядомы.

Нехта скажа: спяшаўся жыць, шмат працаваў, паспеў пяць разоў ажаніцца, мае шасцярых дзяцей. Усіх падтрымліваў, усюды паспяваў, ніколі не быў улюбёнцам моцных гэтага свету, бо не хаваў свае погляды і перакананні. Разам з тым увесь час моцна піў, і чым далей, тым больш. І вось калі на адну чашу вагаў паставіць усе жыццёвыя дасягненні, славу, вядомасць, а на другую — тую аварыю, то ўсё роўна другая пераважыць. Бо ўсё можна зразумець, нават алкагалізм — гэта хвароба, з якой часта чалавеку не пад сілу справіцца. Але ж п'яным не сесці за руль нават алкаголік можа і абавязаны. З яго інтэлектам і духоўным багажом хіба не разумеў, што кожны раз станавіўся патэнцыйным забойцам, калі паварочваў ключ запальвання ў машыне нападпітку? Разумеў, але сядаў зноў і зноў. Беспакаранасць, кажуць цяпер, зорная хвароба. Можа, і так. І грэх яго двайны, бо не толькі пазбавіў жыцця іншага чалавека, але і разбурыў сваё жыццё. Як трапна ён выказаўся ў сваім відэазвароце, што запісаў пад дамашнім арыштам: «Няма болей ніякага Яфрэмава. Здрадзіў я ўсім». І гэта праўда. Здрадзіў сваім слаўным дзядам і прадзедам, бо п'яная язда і ёсць першая прыкмета плебейства, здрадзіў сваім шматлікім жонкам і дзецям, бо над імі будзе век лунаць цень кляйма забойцы. Здрадзіў сваім сябрам і мільёнам паклоннікаў таленту. Нават уявіць цяжка, як з гэтым ён будзе жыць.

Вельмі шкада і прыкра. І вось яшчэ што: ці стане трагедыя на Садовым коле хоць для некага перасцярогай? Не ўпэўнена. Бо многія моцныя гэтага свету, таксама інтэлектуалы і дурні з грашыма, а з імі процьма простых, бедных, звычайных і нягеглых, выпіваюць ды сядаюць за руль, і не лічаць, што некаму здраджваюць. Усе астатнія аўтаматычна становяцца іх заложнікамі на дарогах.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Даты Падзеі Людзі

18 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1660 год — нарадзіўся Ян Алаізій Кулеша, каталіцкі рэлігійны дзеяч, пісьменнік-палеміст. З 1690-га прафесар красамоўства і грэчаскай мовы ў Пінску, Драгічыне. У 1694—1695 гадах выкладаў грэчаскую мову ў Полацкім езуіцкім калегіуме. З 1695-га — у Бабруйску, праводзіў місіянерскую дзейнасць сярод праваслаўных, падарожнічаў па чарнігаўскай і северскай землях для прапаганды ўніяцтва сярод расійскіх бежанцаў-стараверaў. З 1701-га — у Оршы, потым у Мсціславе. У канцы жыцця займаў кафедру маральнай тэалогіі ў Віленскай акадэміі. Аўтар палемічнага твора «Вера праваслаўная...».

1935 год — нарадзіўся Пётр Адамавіч Амельчанка, беларускі канструктар і вучоны ў галіне трактарнага машынабудавання, доктар тэхнічных навук, прафесар. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1950 год — нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Дворнік, беларускі вучоны ў галіне радыеэкалогіі, доктар біялагічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праблемах экалогіі лесу, мадэляванні міграцыі радыенуклідаў у лясных экасістэмах.

У той жа дзень нарадзілася Наталля Мікалаеўна Ніжнёва, беларускі вучоны-лінгвіст, педагог, доктар педагагічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па сучасных інфармацыйных тэхналогіях вывучэння замежных моў на аснове крэатыўных методык. Аўтар вучэбна-метадычных дапаможнікаў і падручнікаў для ВНУ.

У свеце

1815 год — англа-галандскія і прускія войскі нанеслі вырашальнае паражэнне арміі Напалеона I пры Ватэрлоа.

1905 год — нарадзіўся Леанід Міхайлавіч Лаўроўскі (сапраўднае прозвішча Іваноў), расійскі артыст балета, балетмайстар, педагог, народны артыст СССР. Лаўрэат трох Сталінскіх прэмій.

1935 год — нарадзіўся Юрый Мяфодзьевіч Саломін, народны артыст Расіі, народны артыст СССР. Член-карэспандэнт Расійскай акадэміі адукацыі. Прафесар Тэатральнага вучылішча імя Шчэпкіна. Мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага акадэмічнага Малога тэатра Расіі. У 1990—1991 гадах — міністр культуры Расіі. Зняўся ў фільмах «Вясна на Одэры», «Чырвоная палатка», «ТАСС упаўнаважаны заявіць», «Ад'ютант яго правасхадзіцельства» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі.

1940 год — генерал Шарль дэ Голь ад імя створанага ім у эміграцыі аб'яднання «Свабодная Францыя» звярнуўся да французаў з заклікам аказаць супраціў гітлераўскай акупацыі. У Францыі сфарміраваўся рух Супраціву.

1955 год — выйшаў першы нумар часопіса «Юность» (рэдактар Валянцін Катаеў).

2000 год — у Маскве на аэрадроме Тушына адбыўся першы дабрачынны рок-фэст «Крылы».

Так гаварыў...

СТАЦЫЙ:
«Жыві як можаш, калі нельга як хочацца».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.37	21.45	17.08
Віцебск —	4.18	21.43	17.25
Магілёў —	4.27	21.35	17.08
Гомель —	4.33	21.22	16.49
Гродна —	4.54	21.58	17.04
Брэст —	5.04	21.49	16.45

Месяц

Апошняя квадра 13 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Апалона, Дарафея, Ігара, Канстанціна, Нікандра, Фёдара.*
К. *Альжбеты, Аманды, Паўлы, Марка, Марцэля.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Мяне клікалі мары, прыгоды, вялікія справы! Але канапа крычала гучней за ўсіх.

А пасля генеральнай прыборкі высветлілася, што ў ката не было трохдзённага запору...

Я не лянівы, я — энергазберагальны.

Усё больш заўважна, як чалавек разумны паступова ператвараецца ў чалавека, які гугліць.

У дзяцінстве з бацькамі часта гулялі ў гульню на кухні пад назвай «Хто хутчэй пачысціць бульбу!» Мяне цешыла, што я заўсёды выйграваў.

Толькі цяпер, разумею, што дзесьці мяне падманвалі...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы
тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1848. Нумар падпісаны ў 19.30 17 чэрвеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12